# ВЫВУЧЭННЕ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ СССР І МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

І. І. БАГДАНОВІЧ

Даклад Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева, іншыя матэрыялы XXVI з'езда партыі ўтрымліваюць важныя тэарэтычныя палажэнні і факты, якія дазваляюць глыбока зразумець веліч стваральнай дзейнасці савецкага народа, шматгранныя працэсы сучаснага развіцця ў нашай краіне і за мяжой. Выкарыстанне гэтага ідэйнага багацця садзейнічае ўзмацненню выхаваўчай накіраванасці навучання, павышэнню навуковага зместу гістарычнай адукацыі ў школе.

Знешнепалітычную дзейнасць СССР мэтазгодна вывучаць на заключных уроках пры разглядзе ў курсах гісторыі СССР і навейшай гісторыі пытанняў знешняй палітыкі нашай дзяржавы ў перыяд развітога сацыялізму і міжнародных адносін пасля другой сусветнай вайны.

Прывядзём прыкладны план тэмы «Барацьба СССР, усіх міралюбівых сіл за рэалізацыю Праграмы міру. XXVI з'езд КПСС аб міжнародным становішчы і знешняй палітыцы СССР».

1. Барацьба СССР за рэалізацыю Праграмы міру, прынятай XXIV і XXV з'ездамі КПСС.
2. Умацаванне братняга супрацоўніцтва, адзінства і згуртаванасці сусветнай сістэмы сацыялізму.
3. Адносіны СССР з краінамі, якія сталі на шлях развіцця. Уклад нацыянальна-вызваленчага руху ў справу барацьбы за мір.
4. Развіццё адносін СССР з капіталістычнымі дзяржавамі — матэрыяльная аснова разрадкі. Прычыны новага абвастрэння міжнароднай напружанасці на рубяжы 70—80-х гадоў.
5. Праграма міру на 80-я гады. Барацьба за яе ажыццяўленне.

У залежнасці ад узроўню ведаў класа пытанні рэалізацыі Праграмы міру, выпрацаванай XXIV і XXV з'ездамі КПСС, можна вывучаць на ўзнаўленчым, пераўтваральным ці творча-пошукавым узроўні (гл.: Гора П. В. К разработке проблемы развития познавательной активности и самостоятельности учащихся. — Преподавание истории в школе, 1974, № 5, с. 91—94).

Вывучэнне на ўзнаўленчым узроўні праводзіцца на аснове фактычнага матэрыялу, змешчанага ў дакументах XXVI з'езда, і ведаў вучняў аб галоўных палажэннях Праграмы міру, прынятай на XXIV і XXV з'ездах КПСС. Настаўнік расказвае аб выніках рэалізацыі гэтай праграмы. Школьнікі пад кіраўніцтвам педагога запаўняюць наступную табліцу:

| Асноўныя палажэнні Праграмы міру, прынятай XXIV і XXV з'ездамі КПСС | Вынікі іх рэалізацыі |
| --- | --- |
| | |

На пераўтваральным узроўні работа арганізуецца на аснове матэрыялаў XXVI з'езда. Пры гэтым выкарыстоўваюцца веды вучняў аб асноўных напрамках знешняй палітыкі, вызначаных XXIV і XXV з'ездамі КПСС. Школьнікам прапануецца адшукаць у Справаздачным дакладзе ЦК КПСС XXVI з'езду, сцісла сфармуляваць і запісаць у выглядзе тэзісаў адказы на пытанні: якія намаганні прыкладаў Савецкі Саюз для ліквідацыі ваенных ачагоў? Якіх поспехаў удалося дабіцца ў сферы абмежавання гонкі ўзбраенняў? і г. д. Зробленыя пад кіраўніцтвам настаўніка запісы правяраюцца і карэкціруюцца. У заключэнне робяцца вывады аб правільнасці і рэзультатыўнасці знешнепалітычнага курсу СССР.

На творча-пошукавым узроўні вучні на аснове складзенага па ходу выкладання разгорнутага плана самастойна даказваюць правільнасць і рэзультатыўнасць Праграмы міру. Настаўнік можа выкарыстаць кадры

дыяфільмаў «Ленінская Праграма міру ў дзеянні» ці «Знешняя палітыка СССР. Абарона сацыялістычнай Айчыны», а таксама тэкст Справаздачнага даклада ЦК КПСС, матэрыялы перыядычнага друку. Затым настаўнік правярае, як школьнікі справіліся з заданнем, і робіць неабходныя заўвагі.

Незалежна ад таго, які варыянт выбіраецца для вывучэння пытання, асаблівую ўвагу належыць звярнуць на раскрыццё рэзультатыўнасці і правільнасці знешнепалітычнага курсу КПСС. Тут дарэчы прывесці выказванне таварыша Л. І. Брэжнева: «Калі спытаць любога савецкага чалавека — камуніста ці беспартыйнага, чым адзначаны перш за ўсё шлях нашай партыі за апошнія гады, то ў адказ пачуеш: адзначаны гэты шлях перш за ўсё тым, што ўдаецца захаваць мір». І далей: «...пастаўленыя мэты дасягнуты. Гэта яшчэ раз гаворыць аб велізарных магчымасцях сацыялістычнага ладу.., аб правільнасці прынцыповай, класавай палітыкі нашай ленінскай партыі» (Матэрыялы XXVI з'езда КПСС. Мн., 1981, с. 4).

Высокая ацэнка знешнепалітычнага курсу нашай партыі дадзена ў выступленнях гасцей з'езда. Так, Генеральны сакратар ЦК САПГ Э. Хонэкер сказаў, што калі ў другой палавіне нашага стагоддзя ўдалося дабіцца таго, што Еўропа вось ужо больш як трыццаць год жыве ва ўмовах міру, то рашаючая заслуга ў гэтым належыць КПСС, Савецкаму Саюзу.

Пры вывучэнні ў курсе навейшай гісторыі тэмы «Утварэнне і развіццё сусветнай сістэмы сацыялізму» вучні ўжо азнаёміліся з вырашэннем важных задач па ўмацаванню міжнароднага становішча краін сацыялізму. У сувязі з гэтым мэтазгодна даручыць ім прачытаць да ўрока 1-ы пункт І раздзела Справаздачнага даклада ЦК XXVI з'езду і падрыхтаваць невялікія паведамленні па тэмах: «Умацаванне ўсебаковага супрацоўніцтва краін сацыялістычнай садружнасці» і «Сацыялістычны інтэрнацыяналізм у дзеянні».

На ўроку два вучні робяць паведамленні, а некалькі іншых рэцэнзуюць іх. Абагульняючы выступленні школьнікаў, настаўнік зачытвае наступныя словы таварыша Л. І. Брэжнева: «У цэлым, як бачыце, Цэнтральны Камітэт праводзіў работу велізарнага аб'ёму ў інтарэсах развіцця і паглыблення нашых адносін з сацыялістычнымі краінамі. У развіцці эканомікі, культуры, ва ўдасканаленні грамадскіх адносін, сацыялістычнай дэмакратыі — літаральна ва ўсіх галінах сусветны сацыялізм упэўнена ідзе наперад» (Матэрыялы XXVI з'езда КПСС. Мн., 1981, с. 11).

Вывучэнне 3-га пункта плана мэтазгодна пабудаваць на аснове тэксту 2-а пункта І раздзела Справаздачнага даклада XXVI з'езду КПСС. Вучні самастойна чытаюць і адказваюць на пытанні: у чым сутнасць прапаноў Савецкага Саюза па ўрэгуляванню блізкаўсходняга крызісу? Як пашыраецца супрацоўніцтва СССР з краінамі, што развіваюцца? Якая пазіцыя СССР па пытанню ўрэгулявання ірана-іракскага канфлікту? Якую ацэнку даў з'езд ролі і значэнню руху недалучэння ў барацьбе за мір?

Настаўнік адзначае, што ў адносінах СССР і тых краін, якія развіваюцца, яскрава праяўляецца вернасць нашай партыі асноўным прынцыпам ленінскай знешняй палітыкі. Вызваленыя краіны ўносяць велізарны ўклад у барацьбу супраць каланіялізму, вайны і агрэсіі.

Улічыўшы веды вучняў аб нармалізацыі адносін СССР з капіталістычнымі краінамі ў першай палавіне 70-х гадоў, настаўнік прапануе да наступнага ўрока такія пытанні і заданні: ахарактарызуйце адносіны паміж СССР і заходнееўрапейскімі краінамі на рубяжы 70—80-х гадоў. У чым праяўлялася пагаршэнне адносін паміж СССР і ЗША? Чым яно абумоўлена? Вучні выкарыстоўваюць тэкст Справаздачнага даклада ЦК КПСС XXVI з'езду КПСС і матэрыялы перыядычнага друку.

Пасля гутаркі па пытаннях, дадзеных на мінулым уроку, настаўнік паведамляе факты, якія характарызуюць стан эканамічных, навукова-тэхнічных і культурных сувязей з капіталістычнымі краінамі, падкрэслівае, што яны складаюць матэрыяльную аснову разрадкі. Затым школьнікам прапануецца прачытаць першыя дзевяць абзацаў 4-а пункта І раздзела Справаздачнага даклада і вызначыць прычыны, якія выклікалі новае абвастрэнне міжнароднага становішча на рубяжы 70—80-х гадоў. Выконваючы заданне, вучні абапіраюцца на ленінскае палажэнне аб тым, што знешняя палітыка заўсёды вызначаецца эканамічнымі інтарэсамі, эканамічным становішчам пануючых класаў, што яе трэба разглядаць у цесным адзінстве з унутранай палітыкай, дзеці выкарыстоўваюць раней набытыя веды аб сутнасці агульнага крызісу капіталізму.

Школьнікі павінны зрабіць вывад аб тым, што ў сучасных умовах ад-

бываецца далейшае паглыбленне агульнага крызісу капіталізму, якое праяўляецца ў эканамічных крызісах, росце інфляцыі, беспрацоўя, абвастрэнні міжімперыялістычных супярэчнасцей, узмацненні рабочага і нацыянальна-вызваленчага руху, што «цяжкасці, якія зведвае капіталізм, робяць уплыў і на яго палітыку, у тым ліку, на палітыку знешнюю» (Матэрыялы XXVI з'езда КПСС. Мн., 1981, с. 21). Усё гэта прыводзіць да актывізацыі праціўнікаў разрадкі, росту міжнароднай напружанасці, пагаршэння агульнага стану міжнародных адносін.

Вывучэнне Праграмы міру на 80-я гады можа быць арганізавана ў адпаведнасці з пазнавальнымі магчымасцямі вучняў таксама на ўзнаўленчым, пераўтваральным і творча-пошукавым узроўнях.

На ўзнаўленчым узроўні настаўнік раскрывае сутнасць кожнай з пастаўленых на з'ездзе знешнепалітычных задач:

1. Распаўсюдзіць меры давер'я на ўсю еўрапейскую частку СССР пры ўмове адпаведнага расшырэння зоны мер давер'я краінамі Захаду.
2. Правесці перагаворы па мерах давер'я на Далёкім Усходзе.
3. Разгледзець пытанні, звязаныя з Афганістанам, і ўвязаць іх з пытаннямі бяспекі Персідскага заліва.
4. Весці перагаворы з ЗША па далейшаму абмежаванню стратэгічных узбраенняў.
5. Імкнуцца да дагаворанасці аб абмежаванні разгортвання падводных лодак, аб забароне мадэрнізацыі існуючых і стварэння новых балістычных ракет, размяшчаемых на гэтых лодках.
6. Устанавіць мараторый на размяшчэнне ў Еўропе новых ракетна-ядзерных сродкаў сярэдняй дальнасці краін НАТО і СССР, уключаючы ядзерныя сродкі перадавога базіравання ЗША ў гэтым раёне.
7. Стварыць аўтарытэтны міжнародны камітэт, які б паказаў жыццёвую неабходнасць прадухілення ядзернай катастрофы.
8. Склікаць спецыяльнае пасяджэнне Савета Бяспекі на вышэйшым узроўні, каб знайсці шляхі недапушчэння вайны.

Далей неабходна ахарактарызаваць ініцыятывы і канкрэтныя крокі, зробленыя Савецкай дзяржавай для ажыццяўлення знешнепалітычнай праграмы, прынятай XXVI з'ездам КПСС.

На пераўтваральным узроўні настаўнік прапануе сцісла сфармуляваць знешнепалітычныя задачы, пастаўленыя з'ездам, і запісаць іх у выглядзе тэзісаў ці плана. Выкананне задання правяраецца і карэкціруецца.

На творча-пошукавым узроўні можна арганізаваць самастойную работу з тэкстам Справаздачнага даклада. Вучні на аснове аналізу тэксту і ведаў аб сучасным становішчы міжнародных адносін паказваюць жыццёвую неабходнасць рэалізацыі кожнага з палажэнняў знешнепалітычнай праграмы.

Незалежна ад варыянта арганізацыі работы школьнікаў пры вывучэнні дадзенага пытання асаблівую ўвагу трэба ўдзяліць разгляду пераемнасці паміж Праграмай міру, вызначанай XXIV і XXV з'ездамі партыі, і задачамі ў галіне знешняй палітыкі, сфармуляванымі на XXVI з'ездзе. Гаворачы аб пераемнасці метадаў знешняй палітыкі СССР, трэба паказаць, што ў яе аснове нязменна ляжаць прынцыпы мірнага суіснавання і пралетарскага інтэрнацыяналізму, што знешнепалітычная праграма, выпрацаваная XXVI з'ездам, ёсць «...арганічны працяг і развіццё нашай Праграмы міру ў дастасаванні да найбольш вострых, актуальных праблем міжнароднага жыцця ў нашы дні» (Матэрыялы XXVI з'езда КПСС. Мн., 1981, с. 31). Пераемнасць, арганічная сувязь рашэнняў XXIV—XXV—XXVI з'ездаў азначае буйны крок у творчай распрацоўцы важнейшых тэарэтычных і практычных праблем марксісцка-ленінскага вучэння аб знешняй палітыцы сацыялістычнай дзяржавы і перш за ўсё:

— аб асноўных прынцыпах савецкай знешняй палітыкі і прынцыпах узаемаадносін нашай краіны з братнімі сацыялістычнымі і іншымі дзяржавамі;

— аб мірным суіснаванні дзяржаў з розным грамадскім ладам;

— аб пралетарскім інтэрнацыяналізме як адным з асноўных прынцыпаў марксізму-ленінізму і знешнепалітычнай дзейнасці Савецкай дзяржавы;

— аб значэнні разрадкі міжнароднай напружанасці для справы міру і сацыяльнага прагрэсу.

На канкрэтным матэрыяле трэба паказаць, што знешнепалітычныя задачы, вызначаныя XXVI з'ездам, атрымалі гарачую падтрымку ў прадстаўнікоў камуністычных і рабочых партый, усіх міралюбівых сіл. Рашэнні з'езда сталі баявой праграмай барацьбы за ўсеагульны мір не толькі для нашай краіны, але і для ўсіх людзей, глыбока зацікаўленых у пазбаўленні чалавецтва ад пагрозы тэрмаядзернай вайны.